**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ В.А. Богуш
04.02.2015
Рэгістрацыйны № ТД-Е.563/тып.

# ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

**Тыпавая вучэбная праграма**
**па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці**
**1-23 01 10-01 Літаратурная работа (творчасць)**

**УЗГОДНЕНА**
Першы намеснік
Міністра інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ Л.С. Ананіч
18.02.2014г.

Старшыня Вучэбна-
метадычнага аб'яднання
па гуманітарнай адукацыі
______________ А.В. Данільчанка
______________ 4г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўлення вышэйшай
адукацыі Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ С.І. Раманюк
04.02.2015

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце
Дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
______________ І.У. Цітовіч
08.12.2014

Эксперт-нормакантралёр
______________ Н.С. Кішэвіч
08.12.2014

Мінск 2014

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Кузьміч Наталля Васільеўна*, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЕЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»;

Друк Галіна Мацвееўна – дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 9 ад 16.01.2014 г.)
Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 3 ад 29.01.2014 г.)
Навукова-метадычным саветам па журналістыцы Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 3 ад 31.01.2014 г.)

Адказны за выпуск: Кузьміч Н.В.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма вучэбнай па дысцыпліне «Тэорыя літаратуры» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту АСВА 1-23 01 10-2013 па спецыяльнасці 1-23 01 10 «Літаратурная работа (па напрамках)».

Курс па тэорыі літаратуры – важны кампанент падрыхтоўкі будучых творчых спецыялістаў (літаратурных рэдактараў, рэдактараў-стылістаў, рэдактараў-кансультантаў) у галіне паэзіі, прозы і драматургіі. Будучы рэдактар павінен **мець** навык прафесійнай работы з мастацкім тэкстам, які складае неад'емную частку культурнага набытку як асобнага чалавека, так і грамадства наогул.

Курс арыентаваны на абуджэнне цікавасці да разумення твора як асаблівага мастацкага свету, у якім выяўлены рысы асобы мастака. Разбурэнне стэрэатыпу ўспрымання твора як рэчаіснасці, дзе дзейнічаюць «жывыя людзі», дэманстрацыя складанай арганізацыі мастацкага тэксту павінны даць студэнтам навыкі зносін з чужой свядомасцю, што з'яўляецца адной з важных задач журналістыкі. Тэорыя літаратуры з'яўляецца метадалагічнай базай для ўсіх дысцыплін філалагічнага цыкла.

**Мэта** дадзенага курса – навучыць студэнтаў абгрунтавана і комплексна ставіцца да твораў літаратуры, прымяняць атрыманыя веды на практыцы, арыентавацца ў разнастайнасці відаў літаратурных твораў, мець уяўленні пра стылі і жанры, ведаць асаблівасці літаратурна-мастацкага працэсу, улічваючы традыцыі як айчыннай, так і сусветнай літаратуры, а таксама тэндэнцыі метадалогіі аналізу літаратурных твораў.

Агульную **накіраванасць** курса складае вызначэнне сістэмы, метадаў і прынцыпаў, якія б садзейнічалі як аналітычнаму, так і практычнаму падыходу пры стварэнні літаратурнага твора. Даследаванне падыходаў да стварэння мастацкага тэксту дазваляе ўявіць цэласную карціну пераемнасці традыцый паміж класічнай літаратурай і найноўшымі практыкамі складання літаратурнага твора, а на аснове гэтай карціны разгледзець мастацкі твор як складаную шматузроўневую з'яву.

Курс **прадугледжвае** спалучэнне тэарэтычных ведаў з самастойнай практычнай дзейнасцю студэнтаў (напрыклад, вызначэнне асаблівасці змястоўна-фармальных кампанентаў у літаратурных творах розных жанраў).

У сувязі з тым, што літаратура і мастацтва займаюць важнае месца ў сацыякультурным жыцці чалавека, дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» адыгрывае значную **ролю** ў падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнай сферы наогул і асабліва ў падрыхтоўцы тых спецыялістаў, адной з важных задач прафесійнай дзейнасці якіх з'яўляецца непасрэднае стварэнне літаратурных твораў. Гэтая дысцыпліна з'яўляецца заканамернай і неабходнай часткай у сістэме літаратурнай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 10-01 «Літаратурная работа (творчасць)» і займае важнае **месца** ў падрыхтоўцы спецыялістаў дадзенага профілю. Вучэбны курс дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» ўзаемадзейнічае **з вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента:** «Філасофія» і «Замежная літаратура», а таксама з вучэбнымі

дысцыплінамі кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі: «Культуралогія», «Гісторыя мастацтваў», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура», якія спрыяюць разуменню мастацтва і літаратуры, а таксама садзейнічаюць паглыбленаму трактаванню мастацкага твора як складанай вобразнай і светапогляднай сістэмы.

Асноўнымі **задачамі** дысцыпліны з'яўляюцца:

– знаёмства з асноўнымі катэгорыямі тэорыі літаратуры ў кантэксце сусветнай літаратуры;

– разгляд падыходаў да аналізу твора літаратуры;

– фарміраванне ўяўлення пра мастацкі твор як цэласнае адзінства;

– знаёмства з асаблівасцямі генезісу літаратурнай творчасці.

Па заканчэнні вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

– асноўныя катэгорыі тэорыі літаратуры ў кантэксце сусветнай культуры;

– сучасныя трактоўкі тэарэтычных літаратурных праблем;

– тэарэтычнае асэнсаванне асаблівасцей станаўлення і развіцця літаратурнага працэсу.

Студэнты павінны **ўмець**:

– аналізаваць літаратурны тэкст з улікам спецыфікі культурна-гістарычнага кантэксту;

– даследаваць арганізацыю мастацкага тэксту;

– усведамляць ролю літаратуры ў гістарычным працэсе і ў фарміраванні грамадскай думкі;

– выяўляць заканамернасці развіцця літаратурнага працэсу.

Студэнты павінны **валодаць**:

– методыкай аналізу літаратурных тэкстаў розных мастацкіх сістэм;

– навыкамі выяўлення асаблівасцей творчай манеры пісьменнікаў;

– прыёмамі стварэння твораў у розных відах літаратурнай творчасці.

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны.** У выніку засваення лекцыйнага курса, удзелу ў семінарскіх занятках, вывучэння неабходнай літаратуры і азнаямлення з творамі літаратуры ў розных жанрах студэнт павінен арыентавацца ў крытэрыях і прынцыпах ацэнкі мастацкага твора, ведаць асноўныя мастацкія стылі, разумець спецыфіку стварэння мастацкага тэксту, разглядаць і разумець твор літаратуры як складае мастацкае цэлае. Веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння курса, студэнты павінны выкарыстоўваць у сваёй будучай прафесійнай дзейнасці ў якасці журналістаў, крытыкаў, літаратараў, рэдактараў аддзелаў мастацкай літаратуры ў спецыялізаваных СМІ па літаратуры і мастацтве.

**Прыкладнае размеркаванне часу па відах дзейнасці** – 120 гадзін, з іх аўдыторных 68 гадзін (24 лекцыйных, 44 адводзіцца на практычныя заняткі). Рэкамендаваная форма выніковага кантролю – залік.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | у тым ліку | |
| | | | лекцыі | Практычныя заняткі |
| **1. Асноўныя паняцці тэорыі літаратуры** | | | | |
| 1.1. | Тэорыя літаратуры ў сістэме літаратуразнаўчы дысцыплін | | 2 | |
| **2. Літаратура як від мастацтва** | | | | |
| 2.1. | Сутнасць мастацтва | | 2 | |
| 2.2. | Мастацтва і яго віды | | 2 | |
| 2.3 | Літаратура як від мастацтва | | 2 | |
| **3. Літаратурны твор як мастацкая цэласнасць** | | | | |
| 3.1. | Змест і форма літаратурнага твора | | 2 | |
| 3.1.1 | Змест літаратурнага твора: тэма, праблема, ідэя, пафас | | 2 | 4 |
| 3.1.2 | Форма літаратурнага твора | | 2 | 22 |
| 3.2. | Родавая, відавая, жанравая класіфікацыя літаратурных твораў | | 2 | 8 |
| 3.3. | Прынцыпы разгляду літаратурнага твора | | 2 | 4 |
| **4. Твор літаратуры ў гісторыка-культурным кантэксце** | | | | |
| 4.1. | Функцыянаванне літаратуры | | 2 | |
| 4.2. | Заканамернасці развіцця літаратуры | | 4 | 6 |
| | **РАЗАМ:** | **68** | **24** | **44** |

## Змест вучэбнага матэрыялу

## РАЗДЗЕЛ 1. АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ ТЭОРЫІ ЛІТАРАТУРЫ

**Тэма 1.1. Тэорыя літаратуры ў сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін.** Літаратуразнаўства як філалагічная навука аб сутнасці, паходжанні і развіцці мастацкай славеснасці. Месца літаратуразнаўства ў сістэме гуманітарных навук. Праблема дакладнасці ведаў і тэрміналогіі ў літаратуразнаўстве. Суадносіны галоўных (тэорыя літаратуры, гісторыя літаратуры, літаратурная крытыка) і дапаможных (біяграфістыка, тэксталогія, гістарыяграфія, крыніцазнаўства, літаратурнае краязнаўства, архівазнаўства, інш.) літаратуразнаўчых галін.

Тэорыя літаратуры як дысцыпліна, якая сістэматызуе інфармацыю пра спецыфіку мастацкай літаратуры, пра асаблівасці яе зместу і формы ў іх гістарычным развіцці, пра цэласнасць мастацкага твора і яго функцыянаванне, пра літаратурны працэс.

Метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства, абумоўленыя прадметам яго вывучэння: разуменне спецыфічнай прыроды, генэзісу, заканамернасцей гістарычнага развіцця і грамадскага значэння мастацкай славеснасці. Вытокі літаратуразнаўчай метадалогіі ў гісторыі сусветнай эстэтыкі і літаратурнай крытыкі.

Разгляд у складзе курса важных з'яў гісторыі навукі аб літаратуры (як айчыннай, так і замежнай); узнікнення і эвалюцыі паняццяў і тэрмінаў; сувязі літаратуразнаўства з эстэтыкай і іншымі сумежнымі навуковымі дысцыплінамі (мастацтвазнаўствам, гісторыяй, сацыялогіяй, лінгвістыкай, аксіялогіяй, культуралогіяй).

## РАЗДЗЕЛ 2. ЛІТАРАТУРА ЯК ВІД МАСТАЦТВА

**Тэма 2.1. Сутнасць мастацтва.** Мастацтва як пазнаваўчая дзейнасць (да гісторыі пытання). Мастацтва і іншыя формы культуры.

Адлюстраванне мастацтвам эстэтычна каштоўнаснага. Ігнараванне сувязей мастацкай творчасці з эстэтычным у многіх тэарэтычных работах другой паловы XIX – першай паловы XX стагоддзяў.

Мастацтва як творчая дзейнасць. Гісторыя ўсведамлення творчай прыроды мастацтва. Сувязь мастацтва з пазамастацкімі формамі творчасці.

Мастацтва як рэалізацыя творчай энергіі мастака. Мастацкая дзейнасць і міфатворчасць. Гульнявы кампанент мастацкай творчасці.

Мастацтва як пазнаваўчая дзейнасць. Антычная тэорыя прыпадабнення (мімезіса) як першы вопыт усведамлення пазнаваўчых пачаткаў мастацтва. Паняцце пра тыповае і тыпізацыю ў мастацтве. Тэматыка мастацкіх твораў. Мастацтва як адлюстраванне канкрэтна-гістарычных уласцівасцей жыцця і яго агульнабыційных пачаткаў. Вечныя тэмы.

Ідэйна-сэнсавы бок мастацкай творчасці. Тэрмін «ідэя» ў дачыненні да мастацтва і сінанімічныя яму выразы (ідэйны або мастацкі змест; аўтарская канцэпцыя, або пазіцыя, або пункт гледжання; мастацкі сэнс). Тыпы ідэйна-эмацыянальных адносін да жыцця (віды пафасу), якія ўвасабляюцца ў мастацтве; пытанні іх вывучэння.

Адлюстраванне ў творах мастацтва філасофскіх, сацыяльна-палітычных, эстэтычных, этычных, рэлігійных ідэй.

Дзейнасць уяўлення як пасылка і стымул для стварэння мастацкіх вобразаў. Неўсвядомленасць вымыслу ў славеснасці, якая мае дачыненне да міфалагічнай свядомасці. Станаўленне свядомага вымыслу (казка ў фальклоры; апрацоўка паданняў і міфаў у антычнай літаратуры). Вымысел у рэалістычнай літаратуры і яго межы; значэнне назірання за жыццём і выкарыстоўванне прататыпаў і пратасюжэтаў. Адмаўленне мастацкага вымыслу ў 20-я гг. XX ст. Праблема дакументальнай літаратуры («літаратуры факта»), якая валодае мастацкасцю.

Уздзеянне мастацтва на эстэтычныя густы, маральную свядомасць, разумовы кругагляд асобы і грамадства. Катарсіс. Спрычыненасць да матацкіх каштоўнасцей як адна з умоў фарміравання асобы і яе «цэласнага духоўнага самавызначэння» (Г. Паспелаў).

**Тэма 2.2. Мастацтва і яго віды.** Мастацтва як асобая сфера чалавечай культуры.

Вобразная прырода мастацтва. Значэнне тэрміна «вобраз». Двухбаковая прырода мастацкага вобраза як фармальна-змястоўнай катэгорыі, якая адлюстроўвае эстэтычныя ўласцівасці свету ў іх канкрэтна-пачуццёвай шматстайнасці. «Самадастатковасць» вобразаў мастацтва ў адрозненне ад іншых відаў вобразнасці, якія маюць дапаможнае значэнне ілюстрацыі (навуковай, рэкламнай, публіцыстычнай) і фактаграфічнай (мемуарнай, дакументальнай). Вобраз і знак, мадэль, схема: рухомасць межаў паміж імі. Роля творчай фантазіі аўтара ў стварэнні мастацкага вобраза. Першасная ўмоўнасць і экспрэсіўнасць вобразаў мастацтва, звернутых да асабістага эмацыянальнага ўяўлення і разлічаных на «сатворчасць» чытача, гледача, слухача.

Паходжанне мастацтва з першабатнай сінкрэтычнай творчасці. Яго сувязь з рытуалам, магіяй, міфалогіяй (агульнае і адрознае ў прынцыпах вобразнага асваення рэчаіснасці). Роль міфалагем у развіцці мастацкай вобразнасці. Мастацтва як стварэнне новых («культурных») міфаў. Мастацтва і гульня.

Віды мастацтва, іх класіфікацыя. Экспрэсіўныя і пластычныя пачаткі ў фактуры мастацкага вобраза, іх сэнсавае значэнне.

**Тэма 2.3. Літаратура як від мастацтва.** Літаратура як мастацтва слова. Спецыфіка славеснага мастацтва. Месца літаратуры сярод іншых відаў мастацтва. Шырыня пазнаваўчых магчымасцей літаратуры, яе актыўная

праблемнасць. Знакавасць і сімвалічнасць славеснага мастацтва. Выдзяленне славеснага мастацтва з фальклорнага сінтэзу слова, жэсту, мелодыі.

Мова як прадмет мастацкага адлюстравання. Маналогі і дыялогі як узнаўленне мысліцельных працэсаў, светасузіральных эмоцый і інтэлектуальных зносін. Неаўтарская (чужая) мова ў творы. Шматгалоссе ў літаратуры.

Літаратура як мастацтва слова. Своеасаблівасць яе «матэрыялу». Інтанацыйная экспрэсіўнасць і рытмічнасць мастацкай мовы як фактара эстэтычнага ўражання. Асацыятыўнасць славеснага вобраза. Цяжкасці перакладу літаратурных твораў на іншыя нацыянальныя мовы. Выяўленча-экспрэсіўныя і пазнаваўчыя магчымасці мовы. Магчымасць узнаўляць як «неславесную» рэчаіснасць, так і маўленчую дзейнасць людзей, як знешнія бакі жыцця чалавека, так і яго духоўны свет.

Мастацкі вобраз. Суадносіны паняццяў «прататып», «тып», «мастацкі характар», «персанаж», «герой», «вобраз». Адлюстраванне ў творчасці пісьменніка асаблівасцей яго асобы, таленту і светаразумення. Эстэтычныя, рэлігійныя, сацыялагічныя, філасофскія погляды пісьменніка, яго маральныя шуканні як крыніца яго твораў. Творчая рэфлексія мастака і задума твора.

Фальклор і літаратура як самастойныя галіны славеснай творчасці. Калектыўнае і індывідуальнае аўтарства ў фальклоры. Узаемаўплывы фальклору і літаратуры. Літаратура і міфалогія. Спецыфіка міфа як формы пазнання рэчаіснасці. Формы існавання міфа ў сучаснай літаратуры: а) выкарыстанне традыцыйных міфалагічных і фальклорных персанажаў і сюжэтаў; б) стварэнне новага міфа пры дапамозе мастацтва; в) міфалагічныя архетыпы. Праяўленне міфалагічнай свядомасці ў літаратурных тэкстах XX стагоддзя.

## РАЗДЗЕЛ 3. ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР ЯК МАСТАЦКАЯ ЦЭЛАСНАСЦЬ

**Тэма 3.1. Змест і форма літаратурнага твора.** Цэласнасць літаратурнага твора як ідэйна-мастацкай сістэмы. Арганічная еднасць вобразнай формы і эмацыянальна-абагульняючага зместу. Праблема іх аналітычнага размежавання, якая ўзнікла ў еўрапейскай эстэтыцы канца XVIII–пачатку XIX стагоддзяў (Ф. Шылер, Гегель, Гётэ). Навуковая значнасць такога размежавання і яго дыскусійнасць у сучасным літаратуразнаўстве (замена традыцыйных паняццяў на «сэнс», «тэкст», «дыскурс» і г. д.).

Творчая прырода мастацкага зместу і формы, станаўленне іх гарманічнага адзінства ў працэсе ўзнікнення твора («пераход» зместу ў форму і формы ў змест).

**Тэма 3.1.1. Змест літаратурнага твора: тэма, праблема, ідэя, пафас.** Ідэя (абагульняючая эмацыянальна-вобразная думка) як аснова мастацкага

зместу; арганічная еднасць аб'ектыўнага (прадметна-тэматычнага) і суб'ектыўнага (ідэйна-эмацыянальнага) бакоў; умоўнасць такога размежавання ў межах мастацкага цэлага.

Катэгорыя мастацкай тэмы, якая дазваляе суаднесці ідэю твора з яе прадметам, з пазамастацкай рэальнасцю. Аўтарская актыўнасць у выбары тэмы. Канкрэтна-гістарычныя і «вечныя» тэмы. Аўтарская трактоўка тэмы: выяўленне і асэнсаванне жыццёвых супярэчнасцей.

Катэгорыя пафасу. Неадназначнае ўжыванне тэрміна «пафас» у навуцы і літаратуры. Сувязь пафасу з катэгорыяй узвышанага. «Пафас» і «аўтарская эмацыянальнасць».

**Тэма 3.1.2. Форма літаратурнага твора**

***Свет літаратурнага твора.*** Мастацкі свет твора, яго эстэтычная канкрэтнасць, экспрэсіўнасць, сэнсавая і структурная шматпланавасць, сімвалічнасць. Кампаненты і прадметныя дэталі адлюстравання: узноўленыя падзеі, сюжэт, персанажы, прырода (пейзаж), побытавая абстаноўка. Яго жыццепадабанства (ілюзія рэальнасці) або дэманстратыўная сканструяванасць (умоўнасць). Прасторава-часавыя межы, адзінства і завершанасць мастацкага свету. Кампазіцыйныя сувязі элементаў.

***Персанаж (герой) і структура яго вобраза.*** Мастацкая завершанасць персанажа: дынамічнае адзінства канкрэтных падрабязнасцей, якое стварае ўражанне пэўнай індывідуальнасці. Склад і суаднесенасць дэталей, якія абумоўлены функцыяй персанажа ў мастацкім свеце.

Знешняе (партрэтныя дэталі, міміка, жэсты) і ўнутранае аблічча персанажа. Сродкі яго псіхалагічнай характарыстыкі: узнаўленне працэсаў душэўнага жыцця і іх аналіз. Псіхалагічныя дамінанты ў характары (розум, воля, пачуццё, жарсць), якія адлюстроўваюць аўтарскую канцэпцыю. Характар персанажа як устойлівая сістэма паводзін у сюжэце і як носьбіт пэўных каштоўнасных адносін да жыцця. Персанаж і яго каштоўнасная арыентацыя. Персанаж і пісьменнік. Прыёмы псіхалагізму. Мастацкія дэталі.

Мова персанажа як прадмет мастацкага адлюстравання. Мова персанажа ў паэзіі і прозе.

Тыпалогія літаратурных персанажаў (у творчасці пісьменніка, літаратурным кірунку, жанрах). «Вечныя вобразы» ў літаратуры. Перастварэнне персанажаў у адпаведнасці з індывідуальнай задумай аўтара. Станоўчыя і адмоўныя персанажы, іх гістарычная трансфармацыя. Сістэма персанажаў у творы: галоўныя, другарадныя, эпізадычныя.

***Мова мастацкага твора.*** Спецыфіка мастацкай мовы. Паэзія і проза. Літаратурная мова і мова мастацкага твора. Сістэма прамых значэнняў слоў. Словы рознага моўнага асяроддзя.

Слова ў мастацкім кантэксце. Іншасказальнасць, яе віды. Прынцыпы пераносу значэння слоў. Тропы: метафара, метанімія, іронія, інш. Віды метаніміі. Віды метафары. Перыфраз. Простае параўнанне. Разгорнутае параўнанне. Адухаўленне і вобразны паралелізм. Вяртанне страчанай вобразнасці слова ў мастацкім кантэксце. Гіпербала і літота.

Інтанацыйна-сінтаксічная выразнасць мастацкай мовы. Эмацыянальна-маўленчыя інтанацыі, рытарычныя фігуры. Сінтаксічная інверсія і гістарычныя нормы літаратурнай мовы. Славесныя антытэзы. Эліпсіс. Славесныя паўторы; іх разнавіднасці ў паэзіі. Сінтаксічны паралелізм. Градацыя.

***Кампазіцыя.*** Кампазіцыйныя прыёмы. Паняцце пра знешнюю і ўнутраную кампазіцыю. Цыклізацыя твораў.

***Сюжэт як дынамічны бок мастацкага свету.*** Сюжэт як форма ўзнаўлення грамадскіх і асабістых канфліктаў. Сітуацыя, канфлікт, калізія, інтрыга. Узнаўленне ўстойлівых канфліктаў у сюжэтах. Сюжэтныя і пазасюжэтныя элементы. Сюжэтныя лініі і іх адлюстраванне. Хранікальная і канцэнтрычная пабудова сюжэтаў.

Прасторава-часавая арганізацыя сюжэтнага дзеяння. Сімволіка традыцыйных прасторава-часавых каардынат (замкнутая і адкрытая прастора, мяжа, верх і ніз і г.д.). Паняцце пра хранатоп. Суадносіны цяперашняга, мінулага і будучага часу. Міфалагічны, утапічны, гістарычны час. Псіхалагічны час персанажа, знешняя і ўнутраная яго прастора.

Міфалагічныя, літаратурныя, жыццёвыя вытокі сюжэтаў. Міфалагічныя матывы і падтэкст. Рэмінісцэнцыі.

Сюжэт і жанр. Асаблівасці сюжэту ў творах гераічных, маральнаапісальных, раманічных жанраў. Тыпалогія сюжэтаў.

Тэмп і рытм апавядальнай плыні. Часавая дыстанцыя паміж падзеяй і аповедам пра яе. Несупадзенне храналагічнай паслядоўнасці сюжэтных дзеянняў і падзей з парадкам аповеду пра іх. Фабула як кампазіцыя расповеду.

Сюжэт і персанаж у творах драматычнага роду. Выказванні персанажаў у маналогах і дыялогах як асноўны прынцып арганізацыі драматычнай формы. Асаблівасці сцэнічнай мовы. Прастора і час у драме. Суаднесенасць сюжэтнага і сцэнічнага часу. Напружанасць драматычнага дзеяння і паводзіны персанажаў. Аўтарская мова на сцэне. Рэмаркі. Кампазіцыя п’есы.

Мастацкі свет і кампазіцыя лірычнага твора. Лірычны твор як мастацкае ўвасабленне ўнутранага перажывання (уражанняў, роздуму, эмоцый) у яго развіцці.

***Вершаскладанне.*** Рытмічная арганізацыя мастацкай мовы. Паняцце пра славесны рытм. Рытм у паэзіі і прозе.

Паняцце пра сістэмы вершаскладання. Сувязь сістэмы вершаскладання з асаблівасцямі нацыянальнай мовы. Песенныя танічныя вершы. Сілабічныя вершы. Узнікненне і развіццё сілаба-танічнай сістэмы вершаскладання. Свабодны верш.

Радок як адзінка паэтычнага рытму.

Рыфма ў паэзіі і яе роля. Разнавіднасці рыфмы. Віды рыфмоўкі. Сэнсавая роля рыфмы. Узнікненне і развіццё рыфмы. Белы верш.

Гукапіс і гукаперайманне. Гукавое адзінства вершаванага радка.

Страфа як форма арганізацыі вершаванай мовы. Віды строф і спосабы рыфмоўкі. Сінтаксічна-тэматычная завершанасць страфы. Цвёрдыя формы верша.

Паэзія і проза. Славесны тэкст твора як эстэтычна арганізаванае цэлае, як форма існавання мастацкага свету.

***Стыль.*** Стыль як эстэтычнае адзінства і ўзаемадзеянне ўсіх бакоў, кампанентаў і дэталей экспрэсіўна-вобразнай формы мастацкага твора. Стылеўтваральныя фактары ў іх узаемадзеянні. Стыль як паказчык эстэтычнай завершанасці твора. Нарматыўныя стылі кананічных жанраў. Выкарыстанне тэрміна «стыль» да твора, творчасці пісьменніка, групы пісьменнікаў (стылёвая плынь), кірунку. Устойлівыя прыкметы стылю. Стылявы ўплыў, стылізацыя, пародыя.

**Тэма 3.2. Родавая, відавая, жанравая класіфікацыя літаратурных твораў.** Літаратурныя роды і жанры як фармальна-змястоўныя катэгорыі.

Паняцце пра літаратурны род. Падзел літаратуры на роды. Паходжанне літаратурных родаў. Эпас: асаблівасці апавядальнай формы, мастацкі час і прастора. Драма: своеасаблівасць мастацкіх вобразаў, спецыфіка мовы, асаблівасці сюжэту. Лірыка: своеасаблівасць лірычнага твора. Паняцце пра лірычнага героя.

Дыскусійнасць паняцця «літаратурны род» у XX стагоддзі. Падзел літаратуры на тры роды. Эпас: узнаўленне знешняга і ўнутранага жыцця людзей у яго цэласнасці праз аповед пра падзеі. Лірыка: узнаўленне працэсаў унутранага свету людзей (эмацыянальных станаў, перажыванняў, роздуму). Драма: узнаўленне ў п'есах (праз дыялогі і маналогі) дзеянняў людзей, якія прыцягнуты ў канфлікт, які закранае іх інтарэсы і мэты.

Жанр. Жанравыя структуры і каноны. Прынцыпы класіфікацыі. Роды, віды, жанры, жанравыя разнавіднасці: суадносіны ва ўжыванні тэрмінаў. Міжродавыя і пазародавыя формы.

Жанравая класіфікацыя літаратурных твораў. Няўстойлівасць тэрмінаў, якія абазначаюць жанры, і разнастайнасць пунктаў гледжання на іх сутнасць у сучасным літаратуразнаўстве. Прынцыпы падзелу літаратуры на жанры: аб'ём тэксту, які вызначае тэматычны маштаб, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці, пафас, інш.

Паняцце пра сістэму жанраў. Агульныя месцы ў кананічных жанрах (топіка), першынства кананічных жанраў у часы рэфлектыўна-традыцыяналісцкай творчасці (антычнасць, сярэднявечча, класіцызм). Жанр і стыль. Новае разуменне жанра ў эпоху рамантызма. Развіццё некананічных жанраў. Сістэма жанраў у рэалізме.

Вызначэнне жанра твора як формы творчай самарэалізацыі мастака і яго звароту да чытача.

**Тэма 3.3. Прынцыпы разгляду літаратурнага твора.** Апісанне і аналіз. Літаратуразнаўчыя інтэрпрэтацыі. Кантэкстуальнае вывучэнне. Інтэрпрэтацыя зместу мастацкага твора (творчая, крытычная,

літаратуразнаўчая, чытацкая) і праблема мяжы паміж абаснаваным і адвольным яго вытлумачэннем.

Кантэкст творчасці пісьменніка, задума і творчая гісторыя твора як арыенціры для інтэрпрэтацыі.

## РАЗДЗЕЛ 4. ТВОР ЛІТАРАТУРЫ Ў ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

**Тэма 4.1. Функцыянаванне літаратуры.** Успрыманне літаратуры: чытач і аўтар. Прысутнасць аўтара ў творы. Літаратурная крытыка.

Літаратурны працэс у кантэксце культурна-гістарычнага развіцця і праблема яго перыядызацыі. Нацыянальная своеасаблівасць літаратуры, што абумоўлена яе сувяззю з гісторыяй грамадства і нацыянальнай мовы. Міжнародныя сувязі і ўплывы.

Паняцце пра мастацкую сістэму, творчы метад, літаратурны кірунак і плынь.

Мастацкія сістэмы антычнасці і сярэднявечча. Гуманістычная літаратура апохі Адраджэння як мастацкая сістэма. Класіцызм, сентыменталізм, рамантызм – вядучыя кірункі ў еўрапейскіх літаратурах XVII-XVIII – пачатку XIX ст. (агульная характарыстыка эстэтычнай праграмы, творчага метаду, сістэмы жанраў, стылявых тэндэнцый). Выкарыстоўванне ўмоўных форм у рэалістычнай літаратуры. Літаратурныя плыні і кірункі ў XX стагоддзі: рэалізм, мадэрнізм і інш. Паняцце пра літаратурны авангард.

Літаратурны працэс і чытач. Гісторыка-функцыянальнае вывучэнне літаратуры. Характарыстыка некаторых літаратуразнаўчых школ (культурна-гістарычнай, кампаратывізма, фармалізма, структуралізма, вульгарнай сацыялогіі) і сучаснай сітуацыі ў навуцы.

Літаратурныя іерархіі і рэпутацыі. Ваганні літаратурных рэпутацый. Элітарная і антыэлітарная канцэпцыі мастацтва і літаратуры.

Літаратура – белетрыстыка – паралітаратура. Гістарычная зменлівасць сістэмы каштоўнасцей. Узаемапранікненне сфер літаратуры, белетрыстыкі і паралітаратуры. Паняцце пра спецыфіку масавай культуры. Роля журналістыкі ў масавай культуры.

**Тэма 4.2. Заканамернасці развіцця літаратуры.** Генезіс літаратурнай творчасці. Культурная традыцыя. Літаратурны працэс. Дынаміка і стабільнасць. Стадыяльнасць літаратурнага развіцця. Мастацкія сістэмы XIX–XX стст. Асноўныя тэрміны тэорыі літаратурнага працэсу. Нацыянальная спецыфіка літаратуры.

Сучасная літаратура як прадмет вывучэння. Літаратура эпохі таталітарызму як тэарэтычны канструкт і рэальная сістэма. Рэлікты літаратуры савецкага часу ў новай гістарычнай сітуацыі. Змяшчэнне сістэмы каштоўнасцей: «вернутая літаратура», абмеркаванне раней забароненых тэм (літаратура і рэлігія, нацыянальныя аспекты культуры, масавая культура,

інш.), новая перспектыва ўспрымання сусветнай літаратуры. Постмадэрнізм у беларускім варыянце і яго адрозненне ад сусветнага. Змены ў структуры літаратурнага працэсу (змяншэнне ўплыву «тоўстых» часопісаў, узрастанне ролі газет і тэлебачання, з'яўленне інтэрнэт-літаратуры і літаратурнай крытыкі). Страта логацэнтрычнасці ў літаратуры.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Асноўная літаратура

1. Андреев А. Н. Методология литературоведения. – Мн., 2000.
2. Аристотель. Поэтика. Риторика. – СПб.: Азбука, 2000.
3. Барт Р. Избранные работы. Семиотика. Поэтика. – М.: Прогресс. – 1994.
4. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. – М.: Искусство, 1979.
5. Богомолов Н. А. Стихотворная речь. – М., 1988.
6. Введение в литературоведение / Под ред. Г. Н. Поспелова. – М., 1978. (Любое издание).
7. Введение в литературоведение: Литературное произведение. Основные понятия и термины / Под ред. Л. В. Чернец. – М., 1999.
8. Веселовский А.Н. Историческая поэтика. – М.: Едиториал УРСС, 2004.
9. Волков И. Ф. Теория литературы. – М., 1995.
10. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. – М.: Высшая школа, 1994.
11. Кісліцына Г.М. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры. – Мінск: Беларуская навука, 2000.
12. Краткая литературная энциклопедия: В 9-ти т. – М., 1962–1978.
13. Ларин Б.А. Эстетика слова и язык писателя. – Л.: Художественная литература. Ленинградское отделение, 1974.
14. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Советская энциклопедия, 1987.
15. Майсейчык В. І. Практыкум па ўводзінах у літаратуразнаўства. – Мн., 1986.
16. Майсейчык А. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства. Паэтыка мастацкага твора. – Брэст, 2002.
17. Мукаржовский Я. Исследования по эстетике и теории искусства. – М.: Искусство, 1994.
18. Рагойша В. П. На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара. – Мн., 2003.
19. Рагойша В. П. Паэтычны слоўнік. – Мн., 2004.
20. Рагойша В. П. Слоўнік-мінімум па літаратуразнаўству. – Мн., 2000.
21. Рагойша В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. – Мн., 2001.
22. Рагойша В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Курс лекцый (Вершаванне). – Мн., 2002.
23. Основы литературоведения / Под общ. ред. В. П. Мещерякова. – М., 2000.
24. Слоўнік-даведнік асноўных лінгвастылістычных і тэксталагічных тэрмінаў. – Магілёў, 1998.
25. Сорокин Ю.А. Психолингвистические особенности изучения текста. – М.: Наука, 1985.

26.Тарановский К. О поэзии и поэтике. – М.: Языки русской культуры, 2000.
27.Тимофеев Л. И. Основы теории литературы. – М., 1966.
28.Томашевский Б. В. Теория литературы. Поэтика. – М., 1999.
29.Хализев В. Е. Теория литературы. – М., 1999.
30.Эйхенбаум Б.М. О литературе: Работы разных лет. – М.: Советский писатель, 1987.
31.Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5-ці т. – Мн., 1984–1987.
32.Якобсон Р. Язык и бессознательное. – М.: Гнозис, 1996.
33.Яцухна В. І. Тэорыя літаратуры. – Гомель, 2002.

**Дадатковая літаратура**

1. Автор и текст: Сб. ст. / Под ред. В.М. Марковича, В. Шмида. – СПб.: Изд-во С-Петерб. ун-та., 1996.
2. Аймермахер К. Знак. Текст. Культура. – М.: Дом интеллектуальной книги, 1997.
3. Андреев Ю. Волшебное зрение (специфика литературы в современных преломлениях). – Л.: Советский писатель. Ленинградское отделение, 1990.
4. Барт Р. От произведения к тексту // Барт Р. Избранные работы: Семиотика: Поэтика. – М.: Прогресс, 1989. – С. 413–423.
5. Бахтин М.М. Эпос и роман. – СПб.: Изд-во "Азбука". – 2000.
6. Богданов В.В. Текст и текстовое общение. – СПб.: Санкт-Петербургский ун-т, 1993.
7. Введение в литературоведение: Хрестоматия / Под ред. П. А. Николаева. – М., 1997.
8. Виноградов В.В. Проблема авторства и теория стилей. – М.: Гослитиздат, 1961.
9. Выготский Л.С. Психология искусства. – М., 2001.
10. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. – М.: Высшая школа, 1994.
11. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв: Трактаты, статьи, эссе. / Сост. К.Г.Косикова – М.: Изд-во МГУ. – 1987.
12. Лотман Ю.М. Избранные статьи: В 3 т. – Таллинн: Изд-во "Александра", 1992. – Т.1
13. Стральцоў М. У полі зроку. Зб. літ.-крыт. артыкулаў, эцюдаў, эсэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976.
14. Храпченко М.Б. Познание литературы и искусства. Теория. – М.: Наука, 1987.
15. Шмелев Д.Н. Слово и образ. – М.: Наука, 1964.

## Прыкладныя пытанні да экзамену

1. Тэорыя літаратуры як адзін з асноўных раздзелаў навукі аб літаратурнай творчасці.
2. Прырода мастацтва. Мастацтва як форма мыслення і спосаб пазнання свету.
3. Віды мастацтва: вызначэнне, прынцыпы класіфікацыі. Літаратура як від мастацтва.
4. Літаратура як мастацтва слова. Літаратура ў сістэме культуры.
5. Літаратура і СМІ. Спосабы і формы ўзаемадзеяння.
6. Мастацкі вобраз як эстэтычная катэгорыя. Асаблівасці літаратурнага вобраза.
7. Міфалогія – фальклор – літаратура. Міф у сучаснай літаратуры.
8. Вобраз аўтара як філалагічная катэгорыя. Аасблівасці аўтарскай прысутнасці ў лірычным (ліра-эпічным), эпічным, драматычным жанрах.
9. Змест і форма літаратурнага твора як асноватворныя літаратуразнаўчыя катэгорыі.
10. Літаратурны твор як сістэма. Паняцце пра цэласнасць мастацкага тэксту.
11. Роля задумы ў працэсе ўзнікнення твора. Задума – тэма – ідэя (сутнасць і ўзаемасувязь паняццяў).
12. Выбар тэмы. Тэмы вечныя і канкрэтна-гістарычныя.
13. Пафас: эвалюцыя тэрміна.
14. Прадметны свет літаратурнага твора.
15. Літаратурны вобраз. Вобраз персанажа: сродкі стварэння.
16. Мастацкая дэталь. Дэталь і падрабязнасць.
17. Вобраз персанажа. Формы і прыёмы псіхалагізму.
18. Персанаж і яго каштоўнасная арыентацыя.
19. Мова мастацкага твора. Паэзія і проза.
20. Мова як матэрыял літаратуры. Літаратурная мова і мова мастацкага твора.
21. Метафара і яе разнавіднасці. Метафарычнае мысленне ў літаратуры.
22. Паняцце пра тропы. Віды тропаў, іх функцыі. Тропы і іх уплыў на мастацкую манеру пісьменніка.
23. Літаратурны сінтаксіс. Сінтаксіс вершаванай мовы і сінтаксіс празаічнай мовы.
24. Элементы формы: кампазіцыя. Кампазіцыйныя прыёмы.
25. Сюжэт і фабула літаратурнага твора. Сюжэт як сродак раскрыцця характараў персанажаў. Канфлікт і яго роля ў развіцці сюжэта.
26. Неаўтарскае слова: літаратура ў літаратуры.
27. Сістэмы вершаскладання.
28. Сілаба-танічная сістэма вершаскладання.
29. Рытміка. Метрыка. Паняцце пра стапу, памер, метр, рытм.
30. Строфіка. Віды строф. Цвёрдыя формы верша.

31.Белы верш, вольны верш, свабодны верш: жанравыя асаблівасці.

32.Рыфма і яе віды. Роля рыфмы ў стварэнні рытму вершаў. Рыфма і рыфмоўка.

33.Гукапіс літаратурнага твора. Інтанацыя.

34.Літаратурныя роды: прынцыпы класіфікацыі. Літаратурныя роды ў сінтэзе з іншымі відамі мастацтва.

35.Эпас як літаратурны род.

36. Лірыка як літаратурны род. Паняцце пра лірычнага героя. "Паэзія" і "лірыка": суадносіны паняццяў.

37.Асаблівасці драмы як літаратурнага рода.

38.Літаратурныя жанры. Жанравыя канфрантацыі і традыцыі. Кананізацыя жанраў.

39.Міжродавыя і пазародавыя літаратурныя формы.

40.Літаратурныя іерархіі і рэпутацыі. Літаратура, белетрыстыка, паралітаратура: суадносіны ў літаратурным працэсе.

41.Міжнародныя літаратурныя сувязі. Нацыянальная спецыфіка літаратуры.

42.Літаратурны працэс: дынаміка і стабільнасць.

43.Літаратуразнаўства і літаратурная крытыка. Віды літаратурна-крытычных работ. Месца і роля крытыкі ў бягучым літаратурным працэсе.

44.Літаратурны працэс як аб'ект гісторыка-літаратурнага разгляду. Літаратурны працэс нацыянальны і сусветны.

45.Стыль пісьменніка.

46.Жанры літаратуры і праца публіцыста.

47.Мастацкі метад як спосаб вобразнага ўзнаўлення рэчаіснасці.

## Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для бягучага кантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма, якая дзейнічае падчас семестра (гл. «Схему ацэнак ведаў студэнтаў»). Прамежкавымі формамі кантролю засваення дысцыпліны з'яўляюцца аналіз літаратурнага твора ў пісьмовай форме, адказы на тэставыя заданні. Асобную галіну творчай дзейнасці студэнтаў складае практыка літаратурнага рэдагавання. Асноўнай рэкамендаванай формай кантролю з'яўляецца залік па прадмеце, вынік якога можа таксама вызначацца паводле рэйтынгавай сістэмы.

Дадатковымі крытэрыямі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці можа быць напісанне даследчага праекта, творчая праца ў спецыялізаваных СМІ.

### Схема ацэнкі ведаў студэнтаў

1. Актыўнасць на практычных занятках – 1-3 балы
2. Удзел у дыскусіях – 1-3 балы
3. Правядзенне прамежкавых залікаў (пісьмовая праца) – 4-10 балаў

**Выніковая ацэнка:**

| Колькасць набранных балаў | Выніковая ацэнка |
|---|---|
| Меньш за 29 балаў | Нядопуск да заліку |
| Ад 29 да 35 балаў | 4 |
| Ад 36 да 45 балаў | 5 |
| Ад 46 да 55 балаў | 6 |
| Ад 56 до 65 балаў | 7 |
| Ад 66 да 80 балаў | 8 |
| Ад 81 да 90 балаў | 9 |
| Ад 90 да 100 балаў | 10 |

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў і тэхналогій навучання

У выкладанні курса «Тэорыя літаратуры» могуць выкарыстоўвцца наступныя метады: герменеўтычны, кампаратывісцкі, метад сістэмна-цэласнага аналізу. Вывучэнне дысцыпліны спецыялізацыі прадугледжвае чытанне лекцый па тэматыцы кожнага з раздзелаў і правядзенне практычных заняткаў. Шмат увагі пажадана надаць самастойнай рабоце студэнтаў. У ходзе вывучэння раздзелаў дадзенай дысцыпліны слухачам прапанавана спалучаць лекцыйны матэрыял з самастойнай работай над вучэбнай і спецыяльнай літаратурай.

## Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы

Самастойная работа студэнтаў складаецца з падрыхтоўкі да практычных заняткаў, дыскусій, абмеркаванняў, з вывучэння неабходнай літаратуры.

## Спіс рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Падчас семестра праводзіцца вуснае апытанне на занятках, ацэньваюцца выступленні студэнтаў у ходзе дыскусій, семінарскіх заняткаў, а таксама пісьмовыя працы ў выглядзе даследванняў на прапанаваную тэму, адказаў на тэставыя заданні.